**Райчонак, С.** Працоўныя перамогі / С. Райчонак // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). – 2024. – 16 лют. – С. 4.

## ПРАЦОЎНЫЯ ПЕРАМОГІ

**9 лютага аператар машыннага даення адкрытага акцыянернага таварыства «Княж» Ірына Андзілеўка стала лаўрэатам абласной прэміі «Чалавек года Віцебшчыны-2023» у намінацыі «Аграпрамысловы комплекс, ахова навакольнага асяроддзя, лясная гаспадарка».**



Мінулы год у сферы жывёлагадоўлі раёна быў адзначаны нядрэннымі вынікамі па атрыманні малака ў сельгаспрадпрыемствах. Гаспадаркі плюсавалі па надоях у параўнанні з паказчыкамі 2022 года.

Дынаміка станоўчага павышэння надояў малака, стратэгічнага прадукта для вяскоўцаў, назіраецца і ў пачатку сёлетняга года. Па стане на 7 лютага сутачны валавы надой малака па раёне склаў 66 тон або 115 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.

Добрых паказчыкаў у рабоце дасягаюць жывёлаводы малочнатаварнай фермы «Германавічы» адкрытага акцыянернага таварыства «Княж». Тут утрымліваецца 849 галоў буйной рагатай жывёлы, з іх кароў – 422. Валавы надой малака па МТФ за мінулы год склаў 2 тысячы 205 тон, што больш узроўню 2022 года на 141 тону. У сярэднім ад адной каровы атрымана па 5208 кілаграмаў малака (+374 кілаграмы да ўзроўню 2022 года).

Больш за дваццаць год у жывёлагадоўлі працуе Ірына Андзілеўка **(на здымку)**.

Жанчына не шукала лепшай долі ў горадзе, а вырашыла застацца жыць і працаваць у сельскай мясцовасці, на сваёй малой радзіме. Спачатку была даяркай, потым узначальвала

калектыў жывёлаводаў на фермах вёсак Жукі Горныя і Жукі Ложныя. Калі фермы закрылі, пайшла працаваць апаратарам машыннага даення на МТФ «Германавічы». Дарэчы, аб гэтым яна не шкадуе. З году ў год Ірына дасягае высокіх вытворчых паказчыкаў не толькі ў сваёй гаспадарцы, але і сярод апаратараў машыннага даення на раённым узроўні. Гурт яе кароў налічвае 53 галавы. Валавы надой малака за мінулы год склаў 347 тон. У сярэднім ад адной рагулі атрымана па 6553 кілаграмы гэтага каштоўнага прадукта. Не здае сваіх лідзіруючых пазіцый Ірына Андзілеўка і сёлета. За студзень валавы надой малака ў яе гурце склаў 22356 кілаграмаў (422 кг ад адной каровы).

Перадавы апаратар машыннага даення за сваю добрасумленную працу неаднаразова прэміравалася на раённым узроўні. А 9 лютага на сцэне абласной філармоніі яна атрымала з рук старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Субоціна дыплом лаўрэата абласной прэміі «Чалавек года Віцебшчыны-2023». Шчыра віншуем нашу зямлячку з заслужанай узнагародай! Зычым ёй моцнага здароўя і новых працоўных поспехаў!

**Сяргей РАЙЧОНАК,**

фота аўтара.

http://www.klich.by